**Л.В. Обадава** (ДУА “Гаранская дзіцячы сад-сярэдняя школа Полацкага раёна”)

# ЖАНРАВА-СТЫЛЁВЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

***Ключавыя словы:*** прытчавая проза, гістарычны раман, фэнтэзі, эсэ, дэтэктыў.

На сучасным этапе ў выніку сацыяльна-палітычных пераўтварэнняў напрыканцы мінулага стагоддзя грамадства ўступіла ў стадыю кардынальных перамен. Літаратура не засталася абыякавай да гэтых зрухаў. Пісьменнікі розных пакаленняў у сваёй творчасці звярнуліся да мастацкага асэнсавання складаных перыпетый сацыяльнага быцця на працягу дваццатага – пачатку дваццаць першага стагоддзяў. Старэйшыя пісьменнікі пераважна з’яўляюцца прыхільнікамі рэалістычнай творчасці, моладзь больш хінецца да мадэрнізму і постмадэрнізму, сучаснага авангарду, што ідзе з Захаду і з Расіі, адмаўляе многія ранейшыя каштоўнасці і гармонію стылю, аднак падштурхоўвае літаратараў да эксперыменту як у галіне зместу, так і ў галіне формы.

Сярод жанраў, пашыраных у сучаснай беларускай літаратуры, можна выдзеліць наступныя: прытчавая проза, гістарычны раман, аўтабіяграфічная проза, дакументальная проза, фэнтэзі, дэтэктыў, прыгодніцкая проза. Абнаўленне поглядаў на мінулае, чалавека, грамадства, свет – самае істотнае ў прозе апошніх дзесяцігоддзяў. Але відавочна, што ў сувязі са зменамі ў грамадскім жыцці, мастакі слова пераключылі сваю ўвагу на пошук новай мадэлі жыцця, міжчалавечых адносін [2, с. 87–97].

Пры вывучэнні сучаснай літаратуры школьнікі атрымалі магчымасць азнаямлення з філасофскай, прытчавай плынню прозы Янкі Сіпакова (зборнік “Тыя, што ідуць”). Прытчу называюць творам-загадкай, якая патрабуе ад чытача разгадкі. Як адзначае ў сваёй кнізе М.І.Верціхоўская “Вывучэнне беларускай літаратуры 10–11 класах”: “У мудрай прытчы галоўнае дзеянне адбываецца ў душы чалавека і ў яго ўзаемаадносінах з іншымі людзьмі” [2, с. 215].

Павучальнай у гэтым плане з’яўляецца прытча “Як спакайней?” У аснове твора дыялог паміж бандытамі і доктарам. Яго тройчы выклікалі ў раён, прапаноўвалі ўзяць з сабою зброю. Тройчы доктар адмаўляўся ад яе, аргументуючы сваё нежаданне браць зброю тым, што ён змагаецца з вірусамі, мікробамі, хваробамі. Тройчы яго сустракалі бандыты, тройчы яму пагражала смерць. Але ад стрэлу ва ўпор яго ўратаваў дыпламат, што быў у руках. І адін з бандытаў, якія абшуквалі доктара, дараваў яму жыццё, сказаўшы пры гэтым, “што зброя доктара мацнейшая”. Доктар зразумеў, што, калі б ён узяў наган у першы раз, то другога і трэцяга разу не было б.

Сімвалічны вобраз зброі пашыраецца ў творы да бясконцасці: у кожнага свая зброя, свая сіла, не заўсёды трэба вырашаць праблемы пры дапамозе зброі (у прамым разуменні гэтага слова). Ёсць нешта большае за сілу зброі, а гэта важней, чым проста фізічна знішчыць чалавека. Галоўнае, што маральна чалавека, які верыць у сілу дабра, перамагчы немагчыма.

Адзін з вядомых пісьменнікаў Беларусі – Віктар Карамазаў. Амаль трыццаць гадоў ён плённа распрацоўвае мастакоўскую тэматыку ў нашай літаратуры. Прыцягвае ўвагу яго аповесць-эсэ "Крыж на зямлі і поўня на небе". Перад чытачом паўстае асоба такога мастака, як Вітольд Бялыніцкі-Біруля. Віктар Карамазаў далучае нас да непаўторнага свету беларускага мастака. Стварэнне мастацкіх біяграфій пісьменнікам – наватарская з'ява ў беларускай літаратуры, бо ніхто да яго не пісаў пра мастакоў. Сам аўтар адзначаў: "Я адчуў душу мастака, увайшоў у яго псіхалогію. Для нас вобраз мастака вельмі павучальны, гэта цэлая школа выхавання. У мастакоў кандэнсуецца высокая духоўнасць, прыгажосць жыцця чалавека і прыроды" [4, с. 61].

Аповесць Віктара Карамазава дае надзею на выратаванне ад мітусні, неймавернай хуткасці жыцця, надзею на магчымасць перадыхнуць, вярнуцца да вытокаў, да разумення самага важнага, да магчымасці ўбачыць, пачуць і адчуць тое, што выратуе ў цяжкія жыццёвыя моманты.

Алесь Савіцкі, адзін з прадстаўнікоў старэйшага пакалення беларускіх пісьменнікаў, з'яўляецца аўтарам рамана-споведзі "Пісьмо ў Рай". Праз гэты твор пісьменнік сцвярджае спрадвечныя каштоўнасці, маральныя нормы, што складаюць сутнасць жыцця беларуса: дабро, прыгажосць, мір, шчасце, каханне, сям'я, праца, любоў да роднай зямлі, захаванне памяці пакаленняў. Галоўны герой рамана Андрэй Смоліч з маленства спазнаў смак працы, засвоіў павагу да яе, сумленнае стаўленне да справы, якую робіш і ад якой атрымліваеш пэўны плён. Усяму гэтаму яго вучыў бацька, і ўрокі бацькі герой пранёс праз усё жыццё. Сам жанр рамана-споведзі сведчыць пра тое, што герой шчыра спавядаецца перад чытачом і падкрэслівае, "вопыт бацькоў і дзядоў і ёсць, мабыць, тое асноўнае, дзеля чаго прыходзіць у гэты свет чалавек" [7].

Гістарычная тэма ў беларускай літаратуры звязана ў нашым уяўленні з асобай Уладзіміра Караткевіча. У сучаснай літаратуры прадаўжальнікам традыцый Караткевіча з'яўляецца Алесь Наварыч. У гістарычным рамане "Літоўскі воўк", як і яго папярэднік, пісьменнік звяртаецца да часоў паўстання Кастуся Каліноўскага. Але вобраз кіраўніка паўстання з'яўляецца не галоўным, а толькі эпізадычным. Героі рамана – прадстаўнікі шляхты і сяляне-палешукі, носьбіты своеасаблівага бачання і каларытнай мовы. Галоўныя героі паказаны як патрыёты і змагары. Пры разглядзе патрыятычнай праблематыкі вельмі істотны фальклорны аспект, бо фальклор – частка духоўнай культуры народа. Зварот пісьменніка да легендаў і паданняў дае аўтару раскрыць таямніцы нацыянальнага

характару беларускага народа, яго гераічную і трагічную гісторыю. Яскравай удачай пісьменніка з'яўляецца вобраз літоўскага ваўка, які становіцца своеасаблівым сімвалам паўстання, яго лёс усведамляецца як ідэя вольнага жыцця [5].

Сваім настаўнікам лічыць Уладзіміра Караткевіча і Людміла Рублеўская, беларуская паэтка, пісьменнік, драматург. Цікавасць выклікае серыя раманаў "Авантуры Пранціша Вырвіча". Гэты твор спалучае ў сабе рысы гістарычнага рамана і фэнтэзі. Аўтар піша пра тое, што калісьці адбывалася на нашай зямлі, пераносіць чытача ў часы Рэчы Паспалітай, уводзіць у твор гістарычныя асобы. Гэта князі Радзівілы, Кацярына ІІ. Прываблівае чытача каларытная мова. Сярод праблем, якія хвалююць аўтара, – лёс бацькаўшчыны, якой заўсёды даводзілася вагацца паміж рознымі палітычнымі саюзамі і дзяржавамі [6].

Сярод цікавых творчых асоб хацелася вылучыць імя Алеся Аляшкевіча, яго аповесць-дэтэктыў "Белая Дама". Гэты твор пра сучаснікаў, якім прыходзіцца разгадваць загадкі мінулага. Як у сапраўдным дэтэктыве героі адпраўляюцца на пошукі скарбаў, якія нібыта засталіся ў разбураным палацы. А на самай справе ўсё значна прасцей: імкненне завалодаць неіснуючым багаццем, парушыць спакойнае жыццё мясцовых жыхароў. Праўда, ёсць у творы адна рэліквія, якую лічылі страчанай. Гэта старажытны абраз Маці Боскай. Абраз вяртаецца на сваё месца ў храм [1].

У сучаснай беларускай прозе сёння шмат цікавага звязана з творчымі асобамі, якія спакойна спалучаюць стылі, змешваюць гістарычныя факты і фантазію. Сёння назіраецца тэндэнцыя да мінімалізацыі формы ў сучаснай прозе: абразкі, імпрэсіі, мініяцюры, замалёўкі набываюць папулярнасць у чытачоў. Так, у апавяданні Дар'і Палынскай, якое надрукавана ў часопісе "Маладосць" (№1, 2021год), закранаецца важная праблема нашага часу: ці гатова моладзь узяць на свае плечы абавязак быць бацькамі. Апавяданне называецца "Дазвол на бацькоўства". Яно нагадвае мініяцюру, у якой аўтар малюе чалавечыя характары. Маладыя муж і жонка хочуць стаць бацькамі, але адмовіцца ад сваіх звычак, забавак пакуль што не могуць. Аўтар запрашае нас паразважаць над гэтай важнай праблемай, задумацца, чаго ад чалавека патрабуе бацькоўства.

Сучасная беларуская проза – гэта жывы літаратурны працэс, які развіваецца ў розных жанрах, узбагачаецца новымі творамі, вядзе размову з чытачом і часам, напаўняецца энергіяй маладых і сталых пісьменнікаў.

**Літаратура**


1. Аляшкевіч, А.А. Белая Дама Полымя / А.Аляшкевіч. – Мінск : Звязда, 2019. – 47 с.

2. Бельскі, А.І. Проза / Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя / А. Бельскі. – Т. 4. Кн. 2 : Беларуская навука, 2003. – 87-97 с.

3. Верціхоўская, М.І. Вывучэнне беларускай літаратуры ў 10–11 класах / М.Верціхоўская. – Мінск :Адукацыя і выхаванне, 2007. – 215 с.

4. Карамазаў, В. Крыж на зямлі і поўня ў небе / В.Карамазаў / З вясною ў адным вагоне: аповесці, эсэ, дзённік. – Мінск : Юнацтва, 2002. – 61–260 с.
5. Наварыч, А. Літоўскі воўк: гіст. раман / А. Наварыч. – Мінск : Маст. літ., 2005. – 285 с.
6. Рублеўская, Л. Авантуры Пранціша Вырвіча / Л.Рублеўская. – Мінск : Выдавецкі дом “Звязда”, 2017. – 368 с.
7. Савіцкі, А. Пісьмо ў Рай : раман-споведзь / А.Савіцкі. – Мінск : Мастацкая літарутура, 2012.

**Д.Д. Паўлавец**

## ПЫТАННІ МОВЫ І НАЦЫІ Ў ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ

***Ключавыя словы:*** нацыянальная самасвядомасць, родная мова, народ і мова, любоў да Радзімы, лёс Бацькаўшчыны, адступніцтва, гістарычная памяць.

Праблемы жыцця беларускай мовы і нацыянальная самасвядомасць займае адно з галоўных месцаў у творчай спадчыне Янкі Купалы. Яны закранаюцца ў большасці вершаваных твораў і асабліва выразна ў публіцыстычнай спадчыне, у якіх Пясняр доўжыць традыцыі Ф. Багушэвіча, К. Каганца, Цёткі, іншых прадстаўнікоў нашаніўскай эпохі. Яны тычацца многіх фундаментальных пытанняў, што маюць выключнае значэнне для нашага нацыянальнага жыцця і найперш мовы, роднай песні, Бацькаўшчыны, ролі нацыянальнае інтэлігенцыі. Паэт неаднойчы падкрэсліваў сувязь жыцця мовы з жыццём чалавека і ўсяго народа, з ягоным духоўным светам, лічыў яе (мову) маральным стрыжнем, важнейшым сродакам супольнага аб’яднання. Логіка аўтарскай канцэпцыі яскрава выявілася ў артыкуле “***Ці маем мы права выракацца роднай мовы?***”(1914). Тут, здаецца, усё выверана, прадумана, лагічна, трапляе ў цэль. Купала глядзіць на мову як на феномен самавыражэння чалавека, народа і самарэалізацыі ў грамадстве, сусвеце. Як і Ф. Багушэвіч, Купала падкрэслівае, што мова – найважнейшы адрознівальны знак аднаго народа ад другога. На думку Песняра, “***мова ёсць цэнтрам жыцця, яго душой, яго ўнутранай аздобай***”. Гаворачы пра мову як выразіцельку душы і думак, ён параўноўвае яе са “***скіптэрам і каронай, яго*** **(народа – Д. П.)** ***нічым не апаганенай аздобай***”. Заглыбляючыся ў гістарычнае мінулае, Купала згадвае слаўныя часы беларускай мовы ў Полацкім княстве і Вялікім княстве Літоўскім і часы яе занядбання за Рэччу Паспалітай, калі “***беларускія баяры і багацейшыя гараджане, так званая “знаць”, каб заслужыцца на ласку ў польскім урадзе, мець цёпленькае і выгаднае месца, пачалі скідаць з сябе свае родныя аўчынкі і напінаць чужую падробленую, нашываную скуру***”**.** У той жа час большасць беларусаў трымалася свайго роднага, і сілу ў гэтым змаганні надавала мова. “***Гэта душа яго душы – мова зраслася з ім, як***